# ГАРАНТ КВІТНЕЮЧАЙ КРАІНЫ

***15 сакавіка ў фае першага паверха нашага ўніверсітэта, а таксама на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый прайшлі акцыі, прысвечаныя Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Сёлета дадзенае дзяржаўнае свята мела асаблівае значэнне, бо менавіта з гэтага дня ўступіў у сілу абноўлены Асноўны закон нашай краіны.***






Падчас святочнай акцыі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ прымалі ўдзел у займальнай віктарыне, разгадвалі крыжаванку «Законы замежных дзяржаў», збіралі спілс-карту, знаёміліся з кніжнай выставай, атрымлівалі падарункі ад ГА «БРСМ» і віншаванні ад творчых калектываў універсітэта.

«Усім вядома, што Канстытуцыя – Асноўны закон нашай краіны, які валодае вышэйшай юрыдычнай сілай, у якім замацаваны нормы і прынцыпы прававога рэгулявання большасці грамадскіх адносін. Я думаю, трэба зрабіць асобны акцэнт на тым, што гэты дакумент рэгулюе і апісвае не толькі правы, але і нашы з вамі абавязкі як сапраўдных патрыётаў і грамадзян.

27 лютага адбыўся рэспубліканскі рэферэндум. Мне хочацца падзякаваць усім за актыўную грамадзянскую пазіцыю і ўдзел у розных дыялогавых пляцоўках. Я ўпэўнены, што мы з вамі зрабілі правільны выбар і сталі сведкамі яркай гістарычнай падзеі. Новая Канстытуцыя – гэта гарант нашай квітнеючай і спакойнай краіны», – адзначыў прарэктар ВДУ Дзяніс Шкір'янаў.

## По праву памяці жывой

Так гучала тэма сачынення, якое прапанавалі напісаць усім ахвотным да Дня Канстытуцыі на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый у межах традыцыйнай акцыі «Праз дыялог моў – да душы, да сэрца». Акцыя праходзіла ўжо ў дзявяты раз, але ўпершыню ўдзельнікі (студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ФГіМК) пісалі не дыктоўку, а сачыненне. Тэмай яго сталі радкі з паэмы Аляксандра Твардоўскага «По праву памяти». Удзельнікаў не абмяжоўвалі ні ў форме, ні ў аб'еме, ні ў выбары мовы. Кожны мог паразважаць, што для яго значыць Беларусь, што такое памяць, як яна злучае мінулае і будучае, чаму нельга забываць сваю гісторыю і патрэбна захоўваць памяць пра вайну.

Цікава, што многія студэнты расказалі, што пісалі тэксты на беларускай мове. Да прыкладу, Анастасія Касцюкевіч адзначыла, што ў жыцці размаўляе часцей на рускай мове, але што датычыцца артыкулаў і сачыненняў, то ёй больш падабаецца фармуляваць свае думкі на беларускай.

**Віялета КАЗЛОВА, студэнтка 3 курса ФГіМК.**